УДК 378

# АСАБЛІВАСЦІ АДАПТАЦЫІ КУРСАНТАЎ УСТАНОЎ АДУКАЦЫІ СІСТЭМЫ МУС

***А. С. Лаўрова***
*курсант 1 курса факультэта міліцыі*
*Магілёўскага інстытута МУС Рэспублікі Беларусь*
*Навуковы кіраўнік:* ***С. В. Венідзіктаў****,*
*начальнік кафедры сыцыяльна-гуманітарных дысцыплін*
*Магілёўскага інстытута МУС Рэспублікі Беларусь,*
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт*

Адаптацыя — далучэнне арганізма да абставінаў і ўмоў навакольнага свету. У выпадку з сацыяльным асяроддзем гаворку трэба весці аб сацыяльнай адаптацыі, якая ўяўляе сабой працэс актыўнага прыстасавання індывіда да ўмоў сацыяльнага асяроддзя. Гэты працэс характарызуецца дастаткова складанымі псіхалагічнымі асаблівасцямі. Напрыклад, ва ўмовах атрымання адукацыі ва ўстановах сістэмы МУС найбольш востра праблема адаптацыі праяўляецца на працягу першага месяца навучання.

З дапамогай метадаў уключанага назірання і анкетавання мы выявілі асноўныя фактары, якія абцяжарваюць адаптацыю першакурснікаў: 1) распарадак дня (80 % апытаных); 2) сістэма субардынацыі (30 % апытаных); 3) абмежаванасць паступлення знешняй інфармацыі (60 % апытаных); 4) дэфармацыя маўленчых зносін [1] (30 % апытаных); 5) змена кола зносін (80 % апытаных).

Мяркуем, што ў працэсе псіхалагічнай адаптацыі курсантаў да навучання галоўным з’яўляецца адаптацыя да распарадку дня і жыццядзейнасці ва ўмоўна ізаляванай супольнасці. Уплываюць і адрозненні ў сістэме навучання ў грамадзянскай і сілавой УВА. Для апошняй характэрны: 1) спецыфічнасць ведаў, уменняў, навыкаў, накіраваных на нейтралізацыю правапарушэнняў і забеспячэнне правапарадку; 2) разгляд навучання як службовага абавязку, вывучэнне спецыяльных дысцыплін, уключаных у аператыўна-баявую падрыхтоўку; 3) падрыхтоўка з выяўленай практычнай накіраванасцю.

Такім чынам, ва ўстановах адукацыі сістэмы МУС працэс адаптацыі звязаны як з агульнай зменай характару сацыяльнай актыўнасці і пазнавальнай дзейнасці індывідаў, так і неабходнасцю інтэграцыі ў строга рэгламентаваную сістэму органаў унутраных спраў. Паспяховым гэты працэс можна назваць у тым выпадку, калі да заканчэння першага года навучання курсант авалодвае навыкамі эфектыўнай вучэбнай і службовай дзейнасці, засвойвае сістэму субардынацыі, усведамляе самастойнасць выбару прафесіі.

1. Венидиктов С. В., Лукашкова И. Л. Профессиональная этика : учеб. пособие. Минск : РИВШ, 2020. 180 с. Вернуться к статье